# Усё ведаю – чытаю энцыклапедыю

**Кніжныя паліцы аддзела інфармацыйна-бібліяграфічнай работы абласной бібліятэкі імя Я. Карскага папоўнілі новыя энцыклапедыі, якія зацікавяць шырокае кола чытачоў.**




### "Гарады і вёскі Беларусі".

**Энцыклапедыя. Том 8, кніга другая.**

**Першае айчыннае** фундаментальнае выданне, якое праз новыя архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы адлюстроўвае шматвекавую гісторыю. Энцыклапедыя падае звесткі пра сучаснае жыццё ўсіх населеных пунктаў Беларусі. З пачатку 2004 года выйшла 9 тамоў. Яны прысвечаны Гомельскай, Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцям. Кнігі пра Прынёманскі і Прыдзвінскі рэгіёны пакуль у стане планавання.

У 2011 годзе выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выпусціла другую кнігу 8-га тома, прысвечаную населеным пунктам Мінскай вобласці. Выданне змяшчае ілюстрацыі, фотаздымкі, карты, малюнкі.

### "Археалогія Беларусі".

**Энцыклапедыя ў 2 тамах. Том 2.**

**У кнізе асветлены** археалагічныя культуры, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі, апісаны ўсе тыпы археалагічных помнікаў: стаянкі, паселішчы каменнага і бронзавага вякоў, а таксама гарадзішчы, селішчы жалезнага веку, могільнікі і паганскія капішчы. Змешчана інфармацыя пра помнікі архітэктуры сярэднявечча: мураваныя храмы, замкі, палацы.

Энцыклапедыя закранае і ўнікальныя творы першабытнага мастацтва. Дзякуючы навуковым пошукам чытачы змогуць ацаніць прыгажосць ювелірных вырабаў розных эпох, модныя тэндэнцыі жаночай і мужчынскай вопраткі, абутку.

Выданне змяшчае інфармацыю пра краязнаўчыя музеі, археолагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў, даследнікаў, якія працавалі дзеля раскрыцця безлічы таямніцаў сівых стагоддзяў. Кніга багатая на ілюстрацыі, карты, планы і схемы.

### "Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік"

**Слоўнік знаёміць чытачоў** з асновамі духоўнага жыцця і светаўспрымання чалавека, з разнастайнымі народнымі святамі і прысвяткамі. Каштоўны матэрыял прысвечаны павер'ям і прыкметам, засцярогам і замовам. Напрыклад, аўторак лічыўся адным з найбольш спрыяльных для пачатку важных спраў днём тыдня. А ў суботу, наадварот, пачынаць адказныя справы, асабліва вечарам, не раілі.

Складальнікі слоўніка далі максімальна поўнае апісанне міфалагічных істотаў.

Так, на думку беларусаў, на ўсіх застольных бяседах прысутнічае апівень, нячысцік, які чапляецца да людзей, каб схіліць іх да п'янства. Калі ж муж часта сварыцца з жонкаю, то ў іх хаце сядзіць яркун, вораг сямейнага жыцця.

Чытачы знойдуць інфармацыю пра земляробства і жывёлагадоўлю, адносіны продкаў да птушак, жывёл, раслін і з'яў прыроды.

### "Ваенная энцыклапедыя"

**Упершыню ў Беларусі** выйшла «Ваенная энцыклапедыя», у якой суцэльна пададзена ваенная гісторыя Беларусі. У кнізе можна прачытаць пра бітву на Сініх Водах, пасля якой пачалося вызваленне ўсіх славянскіх земляў ад ардынскага панавання. Можна азнаёміцца з Грунвальдскай бітвай, што зруйнавала магутнасць Тэўтонскага ордэна. Шырока прадстаўлены баі і аперацыі, паходы і ўзброеныя паўстанні Вялікай Айчыннай вайны. Шмат артыкулаў прысвечана маршалам, Героям Савецкага Саюза, кавалерам ордэна Славы, камандному складу Узброеных Сіл Беларусі, а таксама афіцэрам і генералам, якія стваралі сістэму айчыннай ваеннай адукацыі. Энцыклапедыя змяшчае неабходны мінімум артыкулаў пра развіццё беларускай арміі, ваенную тэхніку і ўзбраенні, праблемы ваеннага будаўніцтва, ваеннага мастацтва, ваеннай геаграфіі, а таксама пра сучасныя праблемы вайны і міру.

**Агляд падрыхтавала галоўны бібліёграф аддзела інфармацыйна-бібліяграфічнай работы абласной бібліятэкі імя Я. Карскага Ганна МАКАР**

Гродзенская праўда.-2012.-19 траўня.-С.6